# СПРАБАВАЎ ЗДАЦЬ НА МЕТАЛАЛОМ... АВІЯБОМБУ

**У дзяжурную часць Пінскага РАУС паступіла паведамленне аб знойдзеным боепрыпасе.**



Па інфармацыі УУС Брэсцкага аблвыканкама, мужчына, гуляючы на пустцы недалёка ад вёскі Жабчыцы, убачыў, што з зямлі відаць кавалак металу. Вясковец выцягнуў знаходку і вырашыў здаць яе на металалом. Аднак у гэты момант на падазроны аб'ект у руках жыхара вёскі звярнулі ўвагу суседзі, якія запатрабавалі неадкладна пакласці на зямлю прадмет, падобны на боепрыпас, і патэлефанавалі ў міліцыю.

На месца выехалі супрацоўнікі раённага аддзела міліцыі, якія аператыўна перакрылі тэрыторыю для бяспекі грамадзян.

Вайскоўцы сапёрна-піратэхнічнай групы в/ч 7404 ідэнтыфікавалі знаходку як 50-кілаграмовую нямецкую авіяцыйную бомбу, якая выкарыстоўвалася падчас Вялікай Айчыннай вайны, як мяркуецца, для знішчэння аэрадрома, што дзейнічаў на гэтай тэрыторыі.

Авіябомба SD-50 аснашчана адмысловым тыпам узрывальнікаў, таму любое неасцярожнае ўздзеянне на боепрыпас магло прывесці да дэтанацыі. Спецыялісты, пагрузіўшы выбухованебяспечны аб'ект у спецыяльна абсталяваны аўтамабіль, вывезлі бомбу на палігон, дзе яна была паспяхова абясшкоджана.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Фота з сайта УУС Брэсцкага аблвыканкама.**